ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 7 (1005) ● СЕРАДА, 7 сакавіка 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII



**ДАРАГІЯ НАШЫ ЖАНЧЫНЫ — СУПРАЦОЎНІЦЫ І СТУДЭНТКІ УНІВЕРСІТЭТА! РЭКТАРАТ, ПАРТЫЙНЫ КАМІТЭТ, МЯСЦКОМ, КАМІТЭТ КАМСАМОЛА І ПРАФКОМ АД ШЧЫРАГА СЭРЦА ВІНШУЮЦЬ ВАС З ВЯЛІКІМ СВЯТАМ — МІЖНАРОДНЫМ ЖАНОЧЫМ ДНЁМ 8 САКАВІКА.**

**ЖАДАЕМ ВАМ ВЫСОКАГА ТВОРЧАГА ГАРЭННЯ, ШЧАСЦЯ І РАДАСЦІ У СЯМ'І, ПЛЁННАЙ ПРАЦЫ У ГОНАР НАШАЙ РАДЗІМЫ.**

## УСЁ ПА СІЛЕ

Імя доктара геаграфічных навук, прафесара кафедры фізічнай геаграфіі замежных краін Вольгі Піліпаўны Якушкі неразрыўна звязана з геаграфічным факультэтам універсітэта.

Закончыла выдатна наш факультэт і аспірантуру, тут абараняла ў 1949 годзе кандыдацкую дысертацыю і ў 1970 — доктарскую. Як педагог і навуковы супрацоўнік В. П. Якушка бясспрэчны аўтарытэт сярод студэнтаў і супрацоўнікаў. І самае галоўнае ў характары Вольгі Піліпаўны, чаго нельга не пераймаць — сур'ёзныя адносіны да сваіх абавязкаў, высокая дысцыплінаванасць, глыбокая зацікаўленасць у справе. Любая работа, даручаная Вользе Піліпаўне, будзе выканана ў тэрмін (калі не датэрмінова) і абавязкова высокакваліфікавана.

Лабараторыя возеразнаўства — дзецішча В. П. Якушкі. Яна яе «вырасціла» і нязменна на грамадскіх асновах з'яўляецца кіраўніком.

За час работы ва універсітэце В. П. Якушка апублікавала звыш 50 навуковых работ, сярод якіх такія буйныя манаграфіі, як «Геаграфія азёр Беларусі», «Беларускае Паазер'е» і іншыя.

А грамадская работа? Больш дзесяці даручэнняў. І на ўсё знаходзіцца час і выконваецца ўсё з вялікай любоўю. Гэта і выступленні перад студэнтамі ў навукова-даследчым гуртку, у інтэрнаце, перад настаўнікамі школ рэспублікі, перад насельніцтвам.

На геаграфічным факультэце няма студэнта, які б не ведаў Надзежду Паўлаўну Хрыпко, нашага выдатнага педагога, цудоўнага арганізатара, добрага і чулага таварыша. У цяперашні час яна ўзначальвае партыйную арганізацыю факультэта і, нягледзячы на занятасць, вядзе вялікую работу па прапагандзе палітычных ведаў і выхаванню моладзі ў духу актыўных будаўнікоў камуністычнага грамадства. Дзякуючы яе непасрэднаму ўдзелу на факультэце ажывілася грамадскае і культурнае жыццё: сістэматычна праводзяцца вечары, працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці, і як вынік — трэцяе месца факультэта ў агульнауніверсітэцкім аглядзе. Нягледзячы на тое, што Н. П. Хрыпко з'яўляецца дацэнтам кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў, мы лічым яе дацэнтам геафака і за яе вялікую работу гаворым ёй вялікае дзякуй!

З універсітэтам звязана і ўсё жыццё Надзежды Пятроўны Козыр. У 1941 годзе студэнтка II курса геаграфічнага факультэта стала партызанкай атрада «За Айчыну». У 1948 годзе Надзежда Пятроўна закончыла універсітэт і з той пары працуе лабарантам на геафаку.

Немалы тэрмін — чвэрць веку, але гады не кранулі душы, і Надзежда Пятроўна па-ранейшаму маладая, энергічная, заслужана карыстаецца павагай і любоўю усяго калектыву. Яна пастаянна выбіраецца членам універсітэцкага камітэта ветэранаў вайны, з'яўляецца аўтарам навуковых работ. Доўгіх і шчаслівых год вам, дарагія жанчыны!

**Р. ЖМОЙДЗЯК,**
**намеснік дэкана геаграфічнага факультэта.**



## Яна так жыве

Ёсць людзі, аднаго позірку якіх дастаткова, каб адчуць: побач сябар. Яны ўмеюць кароткачасовую сустрэчу зрабіць незабыўнай, могуць адной усмешкай узняць настрой. Але самі не здагадваюцца, якім чароўным талентам валодаюць.

Ім утульна ў любым асяроддзі. І што самае каштоўнае—ад іх прысутнасці ўтульней становіцца тым, хто побач.

Гэты талент, відаць, ад веры ў людзей, нейкага, амаль дзіцячага даверу і шчырасці ў адносінах да іх.

Усё сказанае — не без адрасу. Хто ведае ці проста сустракаўся з Машай Прашкевіч — студэнткай III курса геафака, — пацвердзіць, што яна з гэтай катэгорыі людзей.

Аўтарытэт заваявала яшчэ на першым курсе. Дакладней — перанесла яго сюды з цэхаў трактарнага завода, дзе чатыры гады працавала, дзе найвялікшым прызнаннем яе аўтарытэту была рэкамендацыя ў партыю.

Яшчэ на першым курсе, відаць, улічваючы яе вопыт камсамольскай работы на заводзе, таварышы выбралі сакратаром камсамольскага бюро курса. Наступны год — новае даручэнне — прафсаюзная работа. Цяпер Маша Прашкевіч сакратар студэнцкай партыйнай групы і нештатны карэспандэнт універсітэцкай шматтыражкі.

Грамадская работа ёй дапамагае і ў жыцці, і ў вучобе.

— Я размаўляю з людзьмі і сама ўзбагачаюся. Кожны чалавек—каштоўная крыніца, з якой заўсёды можна нешта пачарпнуць.

У яе ёсць свае меркаванні аб тым, які павінен быць арганізатар на курсе. Як у яе ўсё атрымліваецца, як яна знаходзіць да кожнага свой падыход, расказаць цяжка. Аб якіх рэцэптах можа ісці размова—яна ж проста жыве так. Відаць, гэта сапраўды, як талент,— ад прыроды.

**Т. КОСЦІНА.**

# СЛОВА АБ ДЗЯЎЧАТАХ

*інтэрв'ю*

Славутая спрэчка аб фізіках і лірыках заціхла так раптоўна, як і пачалася. К агульнаму задавальненню высветлілася, што фізікі могуць быць лірыкамі, а лірыкі ў нейкай ступені могуць мець адносіны да прыродазнаўчых навук. Мы лічым, што ў спрэчцы нарадзілася ісціна, таму што ведаем дакладна: адзін фізік — студэнт IV курса нашага фізфака В. Піскароў — піша вершы, а мы, гэта значыць лірыкі, вось ужо добрых паўгода жывём інтарэсамі фізфака.

І вось, добра ведаючы гэтую простую ісціну, мы напярэдадні Міжнароднага жаночага дня смела накіраваліся на фізфак з адзінай мэтай: даведацца, што ўсё-такі падабаецца (або не падабаецца) фізікам-лірыкам у дзяўчатах?

Размова ў нас атрымалася нядрэннай, і мы лішні раз пераканаліся, што фізікі здольныя разбірацца не толькі ў сваіх ашаламляльных формулах, але і ў тонкасцях чалавечай душы.

Аднак дадзім слова ім самім, пачнём з першакурснікаў.

**Аляксандр Іваноў:** Падабаецца сціпласць, не падабаюцца абураючыя павадзіны, якімі некаторыя ўсё-такі яшчэ грашаць. А што датычыцца дзяўчат нашай групы, то ўсе яны вельмі добрыя.

**Віктар Русак:** Вельмі цаню ў дзяўчатах непасрэднасць.

**Сяргей Слюсарэнка:** Мяне прыцягвае ў дзяўчатах сціпласць, уменне прыйсці на дапамогу, прыгажосць, весялосць у любых абставінах, уменне разумець рабят. А яшчэ жадаю, каб было не сумна жыць побач з імі.

**Ігар Казлоў:** Нічога не падабаецца (?!).

Як бачыце, першакурснікі цэняць самыя розныя якасці ў дзяўчатах. Чым гэта растлумачыць? Напэўна, яны яшчэ збераглі непасрэднасць, жывасць успрыняцця свету.

А што скажуць другакурснікі?

**А. Арцёменкаў:** Мне здаецца, што дзяўчына павінна быць сціплай, грацыёзнай і крыху таямнічай, але не развязнай і нахабнай.

**Сяргей Максіменка, Уладзімір Цытра:** Нам у дзяўчатах падабаецца сціпласць. Не прыцягвае надзьмутасць, развязнасць, мудрагелістасць.

Ну што ж, у іх адказах можна заўважыць ужо нейкае адзінства поглядаў.

Трэцякурснікі напалову жартавалі.

**Аляксандр Статкевіч:** Студэнт універсітэта на гэта пытанне адказаць не ў сілах.

**Андрэй Кісялеўскі:** З добрых якасцей на першае месца стаўлю прыгажосць і дабрату. Менш за ўсё цаню іх лёгкадумнасць.

**Уладзімір Траццякоў:** Баюся паказацца банальным, але мне падабаецца сціпласць, не падабаецца надзьмутасць.

**Алег Лосеў:** Вельмі сур'ёзнае пытанне. Здаюся!

З чацвёртакурснікаў нам удалося знайсці толькі аднаго, але і ён быў поўнасцю захоплен кібернетыкай. Пасля нашых настойлівых просьб Аляксандр Турко нарэшце пераключыўся на патрэбную тэму. «Мне думаецца, што дзяўчына перш за ўсё павінна быць даволі разумнай, ніколі не забываць, што яна дзяўчына, і... не вельмі захапляцца матэматыкай»,—сказаў ён і зноў паглыбіўся ў кібернетыку.

І, закончыўшы інтэрв'ю, мы хацелі б па просьбе нашых субяседнікаў і ад нас асабіста сардэчна павіншаваць усіх студэнтак з цудоўным святам вясны і ўсмешак—днём 8 Сакавіка і пажадаць ім быць такімі, якімі б іх хацелі бачыць рабяты.

**У. ЛЯЛЕКА,**
**А. АСТРОЎСКІ.**



*З захапленнем працуюць у гуртку фізічнай геаграфіі СССР многія студэнты геаграфічнага факультэта, а Наташа Дзялендзік выконвае ў ім нялёгкія абавязкі старасты. Вось і цяпер хутка чарговае пасяджэнне...*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*



У інтэрнаце № 5 дружнай сям'ёй жывуць савецкія і замежныя студэнты. Разам рыхтуюцца да заняткаў, разам адпраўляюцца ў кіно ці тэатр.

Тут на ўсіх дзеліцца радасць, і цяжкасці з сябрамі пераадольваюцца лягчэй.

**На здымку** (злева направа): Галіна Бядрыцкая, Чыонг Хоа Бінь, Зоя Усава і До Нгок Лан.

Фота **М. Нечыпарэнкі.**



# ТОЛЬКІ ДЗЕЛЯ СВЯТА...

Дзяўчатам заўсёды цікава ведаць, што пра іх думаюць прадстаўнікі моцнай паловы чалавецтва. І вось каб у нейкай ступені задаволіць іх узрослы напярэдадні свята інтарэс, каб вывесці некалькі формул, праўда, чыста суб'ектыўных, жаночай прыгажосці, з якіх можна скласці агульную формулу, мы звярнуліся да студэнтаў хімфака з пытаннем «Што вам падабаецца ў дзяўчатах?»

Мы спадзяёмся, што тыя, каму падабаюцца хімікі, улічаць сказанае ніжэй, і гэта дапаможа ім, так сказаць...

Такім чынам:

**А. Мацукевіч,** II курс, які кіруецца прынцыпам «залатой сярэдзіны»:

— Сур'ёзныя і задуменныя, але, калі трэба, вясёлыя, прытым умеючыя падтрымаць размову ў патрэбную хвіліну і якія не паводзяць сябе абураюча.

**Невядомы** з III курса. Клічуць «Філя». Яго прынцып: «Што бялей—тое лепш».

— Белыя валасы. А што ў іх яшчэ добрага?

**Багамольскі,** II курс. Вывеў формулу жаночай прыгажосці: сціпласць+густ. Даказваць будзе ў самы бліжэйшы час.

**Двое,** зноў-такі невядомыя, з IV курса.

Першы: Характар і падыход.

Мы: Не дзяўчына, а крэпасць.

Другі: Нічога!

Мы: ...Ой?!!!

**Г. Лахманчук,** I курс:

— Сціпласць і пачуццё такту.

Мы: ...

**Коўкуць,** III курс:

Прынцып: «Пастаянства —вораг дзяўчыны»:

— Ну вось, каб яна была вясёлая, як агонь, мянялася штодзень, пастаянна мяне выводзіла з раўнавагі.

Мы: Няўжо не знайшоў? Ну і нацерпішся!

А вось **П. Балюк,** з V курса, з вопытам чалавека, які пражыў доўгае студэнцкае жыццё і ўсяго пабачыў на сваім вяку, адказаў:

— Дабрата, праўдзівасць, сціпласць.

Мы: Гаспадарлівы.

**Наскову** з II курса падабаюцца толькі непасрэдныя.

Мы: Эзопу таксама...

Зусім выпадкова папаўся студэнт III курса біяфака **Ціхавенка:**

— Знешні выгляд,—адрэзаў ён.

Мы: Так, на біяфаку зусім іншыя запатрабаванні.

Нарэшце, вось яна, дзяўчына хімікаў: павінна быць сціплай, добрай, але з характарам, валодаць пачуццём такту і быць пры гэтым з белымі валасамі.

Мы: Ну як, дзяўчаты?..

Падрыхтаваў **А. ХІЛІМОН.**

# КАМІСАР

**Алег Шадыра,** сакратар камітэта камсамола:

— Аб такіх людзях гаварыць заўсёды прыемна.

**Алег Івашкевіч,** староста II курса, 2-й групы.

— Умее выдатна арганізаваць работу.

**Барыс Карасёў,** камандзір атрада «Спін».

— Ей бы камандзірам быць!

Усе гэтыя цёплыя словы сказаны пра аднаго чалавека, студэнтку II курса хімічнага факультэта Святлану Цурканаву.

Тыя, хто добра ведае гэтую дзяўчыну, не могуць не пагадзіцца з характарыстыкай, якую далі Свеце, іншыя дабаўляюць яшчэ нейкую рысачку, а ў выніку атрымліваецца характар, моцны і цікавы.

На факультэт прыйшла з рабфака. Нялёгка было спачатку. Але старанная, працавітая дзяўчына дабілася свайго: зараз ужо тройкі не паяўляюцца ў яе залікоўцы. Паступова ўцягнулася ў работу камітэта камсамола, занялася шэфствам над школамі. Яна з тых, хто хварэе за любую справу, як за сваю кроўную. Не было такога выпадку, каб Света спазнілася або прапусціла пасяджэнне камітэта камсамола.

Таму і не прыйшлося доўга рашаць, каго паслаць камісарам будаўнічага атрада «Спін» у вёску Вішнёўка Мінскай вобласці.

Зараз, успамінаючы пра жыццё атрада, усе яго байцы ў адзін голас сцвярджаюць, што без Светы ім было б цяжка. Расказваюць пра вясёлыя канцэрты, зусім забыўшыся, як доўга ўгаварвала іх Света арганізаваць агітбрыгаду. Цікавыя газеты, лагер-спадарожнік, сустрэчы з мясцовымі жыхарамі. Ды ці мала чаго цікавага прыдумвала камісар.

ПМК, у якой працаваў атрад, дрэнна забяспечвала будоўлю матэрыяламі. Часта будаўнікі прастойвалі. Тады Света прапанавала: давайце папрацуем на калгасным таку. А потым сама паехала «выбіваць» будаўнічыя матэрыялы.

Бывала, крыўдзіліся на яе хлопцы за прамату і непахіснасць, але ў душы кожны быў згодзен з камісарам. І яшчэ ведалі, якая ўважлівая яна, як балюча рэагуе на ўсё дрэннае, таму адносіліся да яе беражліва.

Алег Шадыра сказаў неяк пра Свету: у яе характары тры галоўныя рысы — добрасумленнасць, любоў да справы, сціпласць.

Ці не гэта галоўнае для таго, каб быць сапраўдным чалавекам!

**Л. ДРУЗЕВА.**

*Выхаванцы БДУ*

# ПРАЗ ГАДЫ І ВЫПРАБАВАННІ

Калі ў пачатку жніўня 1944 года наш універсітэт вяртаўся з падмаскоўнай станцыі Сходня ў Мінск. у склад яго студэнтаў улілася новая буйная група, у якой была і Алена Сямёнаўна Васілевіч.

Як успамінае Алена Сямёнаўна, мара аб паступленні ў БДУ з'явілася адразу, калі яна даведалася, што універсітэт аднавіў сваю дзейнасць пад Масквой. Гэтае паведамленне знайшло А. Васілевіч у Чкалаўскай вобласці, дзе яна працавала бібліятэкарам у шпіталі. Напярэдадні вайны А. Васілевіч скончыла Рагачоўскі настаўніцкі інстытут і жадала працягваць вучобу ва універсітэце, таму адразу выслала дакументы ў БДУ. Але здарылася так, што дакументы ў дарозе згубіліся, і ажыццявіць мару давялося толькі ў жніўні 1944 года.

Уласна кажучы, універсітэта такога, які мы ведаем зараз і наўрад ці можам уявіць іншым, не было, як не было і цяперашняга Мінска. І вучоба ва універсітэце нічым не нагадвала звычайную вучобу: студэнты працавалі на будоўлях, а дакладней, разбіралі руіны, разгружалі вагоны, ездзілі за горад за палівам. Такім жа незвычайным па сённяшнім уяўленням быў і састаў студэнтаў: гэта былі дарослыя, з багатым жыццёвым вопытам людзі, многія з якіх змагаліся на франтах, удзельнічалі ў партызанскім руху, некаторыя карысталіся пэўнай літаратурнай вядомасцю.

Заняткі на філфаку пачаліся ў канцы верасня. Факультэт размяшчаўся ў памяшканні сярэдняй школы № 2, а жылі студэнты ў двух інтэрнатах на Нямізе.

Шмат чаго не хапала, і галоўнае, не было паліва. Навокал інтэрнатаў не засталося платоў і нічога, што можна было б выкарыстаць як дровы. Не хапала сшыткаў. Студэнты вялі канспекты на шпалернай паперы. Часам даводзілася рабіць нечарговыя перапынкі — знікала святло.

Умоў для самастойных заняткаў зусім не было, і студэнты займаліся, у асноўным, у беларускім аддзеле Ленінскай бібліятэкі, які ў той час стаў нейкім своеасаблівым клубам: тут бывалі пісьменнікі, артысты.

Тут, у беларускім аддзеле, Алена Васілевіч пачала пісаць сваю першую аповесць «У прасторах жыцця» («Беларусь», I, 1947 г.). Вобразы і тэма аповесці былі сугучны часу: яна прысвечана падзеям вайны і першых пасляваенных год. Герой аповесці Андрэй Бярозін быў цяжка паранен і застаўся інвалідам, але жаданне быць карысным людзям перамагло апатыю, і ён, нягледзячы на цяжкасці, пачынае працаваць. Толькі адно засмучае яго: думка, што стаў непатрэбным сваёй каханай, Наташы. Таму і не падае ёй звестак пра сябе. Але Наташа сама шукае Андрэя і, нарэшце, знаходзіць. Перад імі раскрываюцца тыя ж прасторы жыцця, якія чакалі іх да вайны.

Змест аповесці значна глыбей простай гісторыі кахання: гэта твор пра аднаўленне мірнага жыцця, барацьбу людзей за сваё шчасце.

Алена Сямёнаўна скончыла універсітэт у 1946 годзе, і ёй, як выдатнай студэнтцы, прапанавалі застацца ў аспірантуры пры кафедры беларускай мовы, аднак Алена Сямёнаўна адмовілася: яе вабіла літаратура.

Сувязь з універсітэтам пісьменніца не парывае. Яе можна ўбачыць на універсітэцкіх літаратурных вечарах, сустрэчах са студэнтамі. З 1950 года пісьменніца працавала ў рэдакцыі часопіса «Работніца і сялянка», і маладыя літаратары, сярод якіх шмат студэнтаў БДУ, знаходзілі ў часопісе не толькі аўтарытэтную трыбуну, але і вопытнага, уважлівага настаўніка — Алену Сямёнаўну Васілевіч. Цяпер Алена Васілевіч — загадчыца рэдакцыі дзіцячай літаратуры выдавецтва «Мастацкая літаратура». Яна — жаданы госць у студэнцкіх аўдыторыях, на літаратурных вечарах.

**С. ПАЛІТЫКА,**
член гуртка гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры.

ГІСТОРЫЯ і гісторыкі шмат ведаюць аб жанчынах. Гісторыкі напісалі шэраг кніг і дысертацый, дзе прасачылі заслугі жанчын на працягу стагоддзяў і ты-

# ВЕДАЕМ,

сячагоддзяў і аддалі ім пашану і славу. У гэтай высакароднай справе з гісторыкамі не могуць спаборнічаць нават паэты. Гістарычная навука нямала зрабіла для жанчын. А жанчыны для яе! Мяркуйце самі.

Сярод прафесарска-выкладчыцкага калектыву гістарычнага факультэта жанчыны складаюць значную частку. Удзельную вагу нашых жанчын у навуковай, вучэбнай і грамадскай рабоце факультэта нельга змераць лічбамі і працэнтамі. Без іх гістфак не быў бы гістфакам.

Нельга ўявіць наш выкладчыцкі калектыў без яго ветэрана—Марыі Парфір'еў-

# ЛЮБІМ,

ны Баранавай. Многія пакаленні гісторыкаў паважаюць Марыю Парфір'еўну як свайго настаўніка. Сотні і тысячы беларускіх педагогаў вучаць гісторыі школьнікаў па падручніку, адным з аўтараў якога з'яўляецца М. П. Баранава. Шмат увагі аддае яна і прафсаюзнай рабоце як член БРК нашага прафсаюза.

За баявы і задорны характар любяць гісторыкі Ядзвігу Паўлаўну Навуменку. Ядзвіга Паўлаўна—адзін з лепшых куратараў факультэта. Гавораць, што яна ведае сваю групу не менш, чым сваю сям'ю. Пры гэтым Я. П. Навуменка вя-

# ПАВАЖАЕМ

дзе вялікую навуковую і вучэбна-метадычную работу.

Ніна Антонаўна Гусакова—вопытны педагог, вучоны, грамадскі дзеяч. Дзякуючы яе намаганням у падшэфным Стаўбцоўскім раёне дзейнічае універсітэт атэістычных ведаў і універсітэт для выкладчыкаў гісторыі.

Не шкадуе сіл і часу для работы на карысць гісторыі Кацярына Андрэеўна Далгушыц. Удасканаленне методыкі выкладання, навуковыя даследаванні, масава-палітычная работа ў студэнцкім інтэрнаце — гэта далёка не ўсе напрамкі яе дзейнасці.

Шматгранная і незаменімая праца нашых жанчын. А пры ўсім пры гэтым яны яшчэ і маці. Дома, у сем'ях, пад пастаяннымі іх клопатамі растуць новыя грамадзяне нашай краіны.

Мы, мужчыны, захапляемся вамі, нашы дарагія жанчыны.

Л. ЛОЙКА,
выкладчык гістфака.



# ВЕЧНАЙ ВАМ МАЛАДОСЦІ!

У дзень 8 Сакавіка многа шчырых, сардэчных віншаванняў прымаюць жанчыны, а разам з віншаваннямі ім гавораць тое, чаго, можа, не было выпадку сказаць раней: што думаюць пра іх, чым яны падабаюцца, на якіх «кітах» трымаецца іх аўтарытэт.

Не менш як 20 пакаленняў журналістаў прайшло школу Ефрасінні Леанідаўны Бондаравай, дацэнта кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, і кожнае атрымала ад яе, вядома, у залежнасці ад сваіх здольнасцей і жаданняў, не толькі веданне выкладаемых ёю прадметаў, а, што найбольш каштоўна, прагу працаваць самастойна і творча, дашуквацца ісціны, непахісна адстойваць свае прынцыпы.

Здаецца, яна валодае невычарпальнай энергіяй і не шкадуе яе, каб абудзіць думку студэнта, дапамагчы яму адчуць сябе журналістам, зрабіць нешта важнае ўжо ў студэнцкія гады. Ну, а сродкаў для гэтага ў арсенале педагога хапае: і выпрабаваных, і эксперыментальных.

Не буду гаварыць пра яе грамадскія справы: як і ва ўсіх такіх няўрымслівых і добрасумленных людзей, іх вельмі многа. А вось пра тое, што сярод яе падапечных заўсёды пяць-сем удзельнікаў конкурсаў студэнцкіх навуковых работ, варта сказаць, бо гэта вельмі красамоўны паказчык.

Партыйная прынцыповасць, вялікія веды, захопленасць працай і шмат яшчэ розных добрых рысачак прыцягваюць да гэтай жанчыны сімпатыі і студэнтаў, і калег.

А. АЛЕНІЧ.

# ВЕРНАСЦЬ ХАРАКТАРУ

Амаль 12 год працягваецца яе навуковая і выкладчыцкая работа ва універсітэце. Фізіка—навука сур'ёзная. І Ніна Мікалаеўна адносіцца да яе вельмі сур'ёзна. І тады, калі пасля педвучылішча паступіла ва універсітэт. І цяпер, калі стала ўжо кандыдатам навук і, здавалася б, можна дазволіць сабе нейкае паслабленне.

Чаму абрала фізіку? Усе ж яе сяброўкі па вучылішчу сталі гісторыкамі. Проста не ўяўляла сябе не фізікам, ды і словы старога любімага выкладчыка запомніла на ўсё жыццё: «Ты, Ніна, на фізфак павінна ісці».

Ой, як даўно яны былі, студэнцкія гады! Вось яна ўжо сама выкладчыца фізікі. Але яе былыя аднакурснікі сцвярджаюць, што колькі б год ні праходзіла, як бы ні мянялася Ніна Мікалаеўна, галоўная рыса яе характару — сур'ёзныя адносіны да справы—застаецца нязменнай. За гэта і яшчэ за цеплыню душы любяць і паважаюць яе студэнты. Для іх, другакурснікаў хімічнага факультэта, Ніна Мікалаеўна Хаўратовіч не проста выкладчык, а і добры сябар:

— Яна настолькі зразумела і даходліва чытае лекцыі, што нават здзіўляешся.

— Выдатны выкладчык. Фізіку нам яшчэ так не чыталі.

— Душэўны чалавек.

— Калі бачыць, што мы стаміліся, пажартуе. Усе разам пасмяёмся, і стомы як не было.

Вядома, работы бывае шмат. З раніцы лекцыі, потым пасяджэнне кафедры ці семінар, сход або якаясьці грамадская справа.

Толькі гэта што! Вось калі дысертацыю пісала, тады было куды цяжэй. І дзеці былі малыя. А цяпер... Слава ўжо зусім дарослы: у восьмым класе. Андрушка і Анюта—у дзіцячым садзіку.

Ніна Мікалаеўна не разумее тых жанчын, што баяцца вялікай сям'і, нават шкадуе іх. Гэта ж так добра—дзеці...

Вечарам яны збіраюцца ўсе разам. Старэйшы рыхтуе ўрокі. Гуляе са сваімі салдацікамі Андрэй. А мама з дачкой «мудруюць» над кавалкам тканіны. Шыецца касцюм для Анюты: хутка ж ранішнік у дзіцячым садзе.

Зараз яна накорміць дзяцей, пакладзе іх спаць, а сама зноў сядзе за свой рабочы стол рыхтавацца да наступнай лекцыі. Роўным святлом гарыць лямпа, перагортваюцца адна за другой старонкі.

І не здагадваецца нават жанчына, як можна ёй пазайздросціць, па-добраму так пазайздросціць.

Л. ПЕРАСЫПКІНА.



*Ва універсітэце Ніна Мікалаеўна Хаўратовіч — член кафедры агульнай фізікі, старшыня групы народнага кантролю факультэта, выкладчык і выхавацель студэнцкай моладзі, якому трэба многа ведаць, многа ўмець.*

*А дома — яна проста мама, клапатлівая, пяшчотная, самая найлепшая.*

Фота Д. ЧАХОВІЧА.



# «НЕ»—АБЫЯКАВАСЦІ

Працоўны ўклад студэнтаў у пяцігодку — выдатная вучоба. А ці з поўнай аддачай мы працуем? Вынікі зімовай залікова-экзаменацыйнай сесіі даюць адказ на гэтае пытанне. На геаграфічным факультэце сярэдні бал 3,9. Гэта далёка не рубеж магчымасцей студэнтаў. Дык у чым жа прычына?

На першым месцы па паспяховасці — IV курс. Пасля першага, які лічыцца цяжкім, чацвёрты курс самы цяжкі. Студэнты здаюць экзамены па многіх спецыяльных дысцыплінах, ускладняецца работа на семінарскіх занятках. І тым не менш сярэдні бал на курсе 4,1. Значыць, справа не ў цяжкасці прадметаў. Узрасла адказнасць студэнтаў за сваю працу.

— Мы проста добрасумленна выконваем свае сацыялістычныя абавязацельствы, — гаворыць Таня Несцярэнка, камсорг першай групы эканомгеографаў IV курса, лепшай групы на факультэце.

Сярэдні бал тут 4,3. Гэты ж поспех не выпадковы. Група гэтая не была ідэальнай (па-мойму, ідэальных груп наогул не бывае). Аднак думаць пра вучобу сталі тут не ў час экзаменацыйнай сесіі або напярэдадні яе.

Справаздачы аб летняй вытворчай практыцы ўсе абаранілі на выдатна і добра. Ні адна двойка, ні адна адмова на семінарскіх або практычных занятках не засталіся без увагі. Вялікая заслуга ў гэтым і куратара Н. І. Жураўскай.

Камсамольцы групы жывуць цікавым жыццём. Усе 29 чалавек з'яўляюцца членамі або слухачамі (такіх значна менш) навуковага студэнцкага гуртка эканамічнай геаграфіі СССР.

Усе разам рабяты арганізоўваюць культпаходы ў тэатры, на выстаўкі, наведваюць прадпрыемствы. Яны пабывалі на Мінскім камвольным і Салігорскім калійным камбінатах.

Прыкметна палепшылася камсамольская работа. Усе ў групе маюць пастаянныя або часовыя камсамольскія даручэнні, рэгулярна праводзіцца палітінфармацыі.

Не ўсё яшчэ дасягнута, і шмат рабятам прыйдзецца папрацаваць. Але галоўнае, тут ужо сказалі «не» абыякавасці і раўнадушнасці да сябе і сваіх таварышаў.

Такая група не адзіная, але, на жаль, яшчэ ёсць на факультэце шмат камсамольскіх груп, дзе трэба прыкласці вельмі многа намаганняў, каб сярэдні бал паспяховасці перавысіў запаветнае 4 і каб камсамольскае жыццё ў калектыве біла крыніцай.

М. КУЛІШЭВІЧ,
студэнтка IV курса.

# Пленум абмеркаваў

Адбыўся пленум камітэта камсамола з павесткай дня «Аб паляпшэнні маральна-эстэтычнага выхавання студэнтаў».

Даклад «Работа камітэта камсамола універсітэта па маральна-эстэтычнаму выхаванню студэнтаў» зрабіў намеснік сакратара камітэта камсамола У. Сілін.

У спрэчках выступілі: Л. Тонкая — сакратар камсамольскага бюро ФПМ, І. Кавалеўская — сакратар камітэта камсамола гістфака, Т. Краўцова—студэнтка юрфака, К. Каваленка—намеснік сакратара камітэта камсамола хімфака, А. Слука—сакратар камітэта камсамола універсітэта і іншыя.

Пленум прыняў пастанову, у якой адзначаецца, што работа па маральна-эстэтычнаму выхаванню моладзі праводзіцца неадрыўна ад вучэбнага працэсу і адпавядае задачам, якія вынікаюць з прамовы Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева на І Усесаюзным злёце студэнтаў і патрабаванням часу.

Было таксама ўказана на некаторыя недахопы ў рабоце, намечаны канкрэтныя меры па іх выпраўленню.

ПРЭС-ЦЭНТР
КАМІТЭТА КАМСАМОЛА

# ПА ПУЦЁЎКАХ ПРАФКОМА

Ці ёсць для студэнта больш вясёлая пара, чым канікулы? Мабыць, няма. Каб гэта было сапраўды так, напярэдадні канікул у прафкоме БДУ абмеркавалі план студэнцкага адпачынку. Больш 60 чалавек атрымалі пуцёўкі ў дамы адпачынку, 16 — у пансіянаты і санаторыі, больш 70 юнакоў і дзяўчат адпачылі на турбазе, а 100 студэнтаў зрабілі цікавую паездку на турпоездзе «Беларусь», які прайшоў па маршруту Мінск—Львоў—Ужгарад — Ярэмча — Брэст — Мінск. Шмат уражанняў у тых, хто адпачываў па пуцёўках прафкома. Вось што расказвае студэнтка гістарычнага факультэта Наташа Анісімава:

— Я разам са студэнткамі нашага універсітэта Тамарай Рысюк і Ленай Яцкавец правяла канікулы ў доме адпачынку «Нарач». За гэтыя 12 дзён мы вельмі добра адпачылі. Было весела і цікава. Нельга не ўспомніць, як адзначалі дні нараджэння, ездзілі ў Вільнюс, па месцах баявой і працоўнай славы.

Ёсць што ўспомніць студэнтам юрфака С. Шусту, Б. Арцёменку і І. Нядзвецкаму, фізікам Н. Каладухіну і В. Дамашэнка — яны правялі канікулы на турбазе «Беларусь», а студэнты О. Зуб з біяфака, Т. Таранчук з фізфака, В. Дудко з ФПМ і іншыя падарожнічалі на турпоездзе «Беларусь», наведалі многія гарады краіны.

Паправілі сваё здароўе ў санаторыях студэнты-журналісты Н. Самажнева, М. Кузняцоў, фізік П. Петрушкевіч і многія іншыя.

І. СЦЯПУРА.
(КАРПУНКТ ПРАФКОМА).

